# УРОК БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

# Ў 9 КЛАСЕ

# ПАДАГУЛЬНЕННЕ І СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ

# ВЫВУЧАНАГА ПА ТЭМЕ

# “Бяззлучнікавыя складаныя сказы”

**Т ы п  у р о к а:** урок-падагульненне па тэме “Бяззлучнікавыя складаныя сказы”. Урок 1 (на падагульненне адводзяцца 2 урокі)
**Ф о р м ы   р а б о т ы:** індывідуальная, у парах, самастойная работа.

**Т э м а т ы ч н а я   а р г а н і з а ц ы я   ў р о к а:** матэрыял на тэму “Прыгажосць роднага краю”

**А б с т а л я в а н н е:** раздатачны матэрыял (кантрольныя пытанні, тэксты, карткі), мультымедыйнае абсталяванне

**Урок 1**
М э т а  і  з а д а ч ы  ў р о к а :

- паглыбіць, сістэматызаваць, адкарэкціраваць веды па тэме “Бяззлучнікавыя складаныя сказы;
- удасканальваць уменне знаходзіць, будаваць бяззлучнікавыя складаныя сказы з рознымі сэнсава-граматычнымі часткамі, інтанаваць іх у адпаведнасці з сэнсавай абумоўленасцю, расстаўляць і абгрунтоўваць знакі прыпынку (коска, кропка з коскай, двукроп’е, працяжнік – норма і варыянты) на аснове выяўлення сэнсавых адносін паміж часткамі, выконваць сінтаксічны і пунктуацыйны разборы бяззлучнікавых складаных сказаў адпаведна парадку і ўзору разбору, удасканальваць уменне адказваць вусна на пытанні па тэме асобна і звязным тэкстам, граматычна правільна афармляць сказы і тэкст на пісьме;
- выхоўваць у вучняў любоў і пашану да роднай прыроды, беражлівае стаўленне да яе.

**Х о д  у р о к а**

**Э п і г р а ф:**

У любую пару года,
У пагоду, непагоду,
Слухай родную
прыроду -
ты пачуеш галасы
таямнічае красы.
*Васіль Жуковіч*

**Ход урока**

1. *Прэзентацыя. Гучыць песня “Мой родны кут” на словы Я. Коласа.*
2. Прывітанне. Звяртаецца ўвага на эпіграф.
3. - Пра што мы будзем сёння гаварыць? (вызначэнне **лексічнай тэмы** размовы “Душа, сугучная з прыродай...”). Сапраўды, прырода нашай краіны вельмі прыгожая, непаўторная. У нас ёсць магчымасць захапляцца ёю ў любую пару года.
Вызначэнне **моўнай тэмы**: “Падагульненне вывучанага пра бяззлучнікавы складаны сказ”.
- Якія веды і ўменні мы сёння павінны прадэманстраваць?
*Ведаць*: сінтаксічныя прыметы складаных бяззлучнікавых сказаў.
*Умець*: знаходзіць бяззлучнікавыя складаныя сказы ў тэкстах, вызначаць сэнсавыя адносіны паміж часткамі, ставіць знакі прыпынку, тлумачыць іх, карыстацца схемамі,

выконваць сінанімічныя замены сказаў розных відаў, ужываць бяззлучнікавыя складаныя сказы ў маўленні, выконваць сінтаксічны разбор бяззлучнікавых складаных сказаў.

4. Праверка дамашняга задання.

Практ 143 (скласці сказы па схемах):

1) [ ]: [прычына].
2) [час] – [ ].
3) [ ]: [дапаўняе 1-ю частку].
4) [ ] – [супрацьпастаўленне].
5) [ ]; [ ].
6) [умова] – [ ].

5. На экране – пералік паняццяў па тэме “Складаны сказ”. Неабходна адабраць тыя (ключавыя), што адносяцца да тэмы “Бяззлучнікавы складаны сказ”. Вучні запісваюць у сшытках нумары

1) злучальная сувязь;
2) галоўная і даданая часткі;
3) сузалежнае неаднароднае падпарадкаванне;
4) злучнікі;
5) злучальныя словы;
6) бяззлучнікавая сувязь;
7) коска;
8) кропка з коскай;
9) падпарадкавальная сувязь;
10) паслядоўнае падпарадкаванне;
11) працяжнік;
12) размеркавальныя сэнсавыя адносіны;
13) двукроп’е;
14) сузалежнае аднароднае падпарадкаванне;
15) аднатыпныя часткі і разнатыпныя часткі.

На экране адказ. Самаправерка

6), 7), 8), 11), 13), 15)

6. Вучні загадзя атрымалі кантрольныя пытанні і заданні. Праверка тэарэтычных ведаў. Эстафета. Пачынае задаваць пытанне настаўнік і далей па ланцужку: той, хто даў правільны адказ, задае наступнае пытанне.

**Кантрольныя пытанні**

1. Якія сказы называюцца бяззлучнікавымі складанымі?
2. З дапамогай якіх сродкаў афармляюцца сэнсава-граматычныя адносіны паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах?
3. Якія сэнсавыя адносіны могуць выражацца паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах з аднатыпнымі часткамі?
4. Якія сэнсавыя адносіны могуць выражацца паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах з разнатыпнымі часткамі?
5. Чым адрозніваюцца бяззлучнікавыя складаныя сказы ад складаназлучаных і складаназалежных сказаў?
6. Якія знакі прыпынку могуць ставіцца на мяжы частак у бяззлучнікавых складаных сказах?

7. Калі ставіцца кропка і кропка з коскай на мяжы частак у бяззлучнікавых складаных сказах?

8. Калі ставіцца двукроп’е на мяжы частак у бяззлучнікавых складаных сказах?

9. Калі ставіцца працяжнік на мяжы частак у бяззлучнікавых складаных сказах?

## 7. Самастойная праца з тэкстам (у парах).
## Заданні да тэкстаў.

Вызначце стыль тэксту.
Пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку. Растлумачце напісанне слоў з прапушчанымі арфаграмамі.
Знайдзіце і запішыце бяззлучнікавыя складаныя сказы.
Пабудуйце схемы, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

**Тэкст 1**
**Подых вясны**

Дыхнула в...сна  з...мля стала вясёлая.

У прагным жаданні парыліся ўзгоркі, ла...чыны купаліся ў тумане. І гулкая не то цішыня шырокіх размахаў, не то песня вясёлай журбы плыла над з...млёй з...мля чакала часу ўзняць сабраныя сілы сваёй творчай здольнасці  ў ла...чынах, драмала пад сонцам, драмала з подыхам шырокім сіняму небу.

Ночы былі зычныя, гулкія і пахлі вадою  вады на зямлі было многа.

Як чакала з...мля людзей у свае палявыя палосы, таксама і людзі чакалі з...млю. Чакалі яе, па...сохлую, новую. Чакалі працы паржавелыя за зіму плугі і бароны.

І яшчэ чакалі вясну людзі  прычакаўшы в...сны адной, чакалі другой.  З...мля была яшчэ чорная, лясы былі сінія  гэта пара ад з...млі агортвала іх, яны ж(ш) агортвалі сабой людзей. Ды яшчэ ці мала людзей хадзіла па ні...кіх кустах, па мокрых алешнікавых паплавах, у гушчарніках лазовых за рэчкамі. Гэта в...сна дазволіла ім пакінуць вёскі. Прапахлі людзі гэтыя вільгац...ю в...снавой з...млі, в...сёлымі мхамі. І начамі ц...гнуліся в...сновыя гукі па родных мясцінах. І былі гэтыя гукі надзвычай гулкімі і (па)вясноваму звонкімі. А людзі чакалі в...сну.

**ЭТАЛОН :**

[Дыхнуля вясна] – [зямля стала вясёлая].

[І гулкая не то цішыня шырокіх размахаў, не то песня вясёлай журбы плыла над зямлёй]: [зямля чакала часу ўзняць сабраныя сілы сваёй творчай здольнасці і ў лагчынах драмала пад сонцам, драмала з подыхам шырокім сіняму небу].

[Ночы былі зычныя, гулкія і пахлі вадою]: [вады на зямлі было многа].

[І яшчэ чакалі вясну людзі]: [прычакаўшы вясны адной, чакалі другой].

[Зямля была яшчэ чорная, лясы былі сінія]: *(-)* [гэта пара ад зямлі агортвала іх, яны ж агортвалі сабой людзей].

**Заданні да тэксту**

Вызначце стыль тэксту.
Пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку. Растлумачце напісанне слоў з прапушчанымі арфаграмамі.
Знайдзіце і запішыце бяззлучнікавыя складаныя сказы.
Пабудуйце схемы, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

**Тэкст 2**
**Над Нёманам**

Над абрывістым берагам Нёмана стаяў стары прысадзісты тоўсты дуб. Доўгі час бера... знаходзіўся пад вадою, паволі асоваўся і агаляў тоўстыя карані старога дуба. Сам гэты дуб крыху пахіліўся (на)бок, працягнуты над вадою яго корань здаваўся нагою – выходзіла так: дуб збіраўся перабрысці Нёман. Сеўшы на гэтым корані, Базыль убачыў: бегалі дробныя хвалі, звівалася ў вадзе доўгая раска; вада то ўздымала яе, то апускала, то ра...кідала ва ўсе бакі і гуляла ёю, як вецер дымам.

Каля самага берага стаяў у вадзе лазовы куст. Ён тое і рабіў, што борздзенька ківаўся пад напорам вады. І (ні)колі (не)меў супачынку гэты куст: і (ў)дзень і (ў)ночы ківаўся ён. Хіба, можа, зімою, як марозы скуюць лёдам ваду, а...пачне гэты пахілак(куст).

Базыль пазіраў і думаў. А вакол было ціха. І Базылю здавалася: ён чуе спевы гэтай цішыні. Доўга ён прыслухоўваўся, але спевы былі нейкія (не)вясёлыя. Хлопцу стала маркотна: усё ішло, здавалася яму, сваёю дарогаю і жыло сваім жыц...ём, сярод якога ён пачуў сябе чужым.

Але гэты магутны, хоць і адзінокі дуб усяляў у душу хлопца надзею: ён адчуваў, што набярэцца моцы і вытрывае ўсе жыццёвыя нягоды.

*Паводле Якуба Коласа*

**ЭТАЛОН:**

[Сам гэты дуб крыху пахіліўся набок], [працягнуты над вадою яго корань здаваўся нагою] – [выходзіла так: [дуб збіраўся перабрысці Нёман]].

[Сеўшы на гэтым корані, Базыль убачыў]: [бегалі дробныя хвалі], [звівалася ў вадзе доўгая раска]; [вада то ўздымала яе, то апускала, то раскідала ва ўсе бакі і гуляла ёю, як вецер дымам].

[І ніколі не меў супачынку гэты куст]: [і ўдзень і ўночы ківаўся ён].

[І Базылю здавалася]: [ён чуе спевы гэтай цішыні].

## Заданні да тэксту

Вызначце стыль тэксту.
Пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку. Растлумачце напісанне слоў з прапушчанымі арфаграмамі.
Знайдзіце і запішыце бяззлучнікавыя складаныя сказы.
Пабудуйце схемы, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

### Тэкст 3
### Восень

Па небе шпарка ляцяць цёмныя воблакі. Ра...паўзаюцца, чапляюцца, збіраюцца ў адзін груд і засцяць неба. Смоўжам звілася над зямелькаю брудна(шэрая) аграмадная пялёнка; яна хавае сонца. Сцюдзёна. З неба белым дымам ляцяць сняжынкі, сіроткамі сыплюцца аднекуль (з)гары, з няяснасці; яны выплываюць і мяк...а кладуцца на зямлю.

Бывае так, што сярод холаду, шэрасці, пустэльнасці і нуды асенняй прыроды, сярод прыкрага надвор...я самай позняй восені па небе неяк раптоўна прагляне маленькі сіненькі лапічак – адзін, другі, трэці. Вось ужо (не)малая частка неба вызваляецца з...за хмар – сіняя, радасная; яшчэ лёгка плывуць па яе берагах прыгожыя фарбы цёмных (па)сяродку і белых наўкол воблачак. Яшчэ вісіць чорная, дажджавая хмара далёка-далёка над лесам, як быццам яна там дужа добра ўчапілася. А зірніце, зірніце хутчэй: вунь там шпарка схавалася апошняя срэбная хмарка цераз сонца. Бліснуў з неба першы сноп светлага калос...я на крыллі пруда(ветрака), перабег залатою пасцілкаю цераз сад – і ўсё весялее, робіцца прыгожым: ціхенька варухнуліся галінкі на старой бярозе, убачыўшы сонца, мякчэйшай хоча быць мёрзлая груда пад нагамі дзяўчыны. Дзяўчына схапіла вёдры, бяжыць да вады, бяжыць і нечага смяецца, а сонейка забылася, забавілася, любуецца дзявоцкай прыгажосц....ю.

*Паводле М. Гарэцкага*

**ЭТАЛОН:**

[Смоўжам звілася над зямелькаю брудна-шэрая аграмадная пялёнка]; [яна хавае сонца].

[З неба белым дымам ляцяць сняжынкі, сіроткамі сыплюцца аднекуль згары, з няяснасці]; [яны выплываюць і мякка кладуцца на зямлю].

[Вось ужо немалая частка неба вызваляецца з-за хмар – сіняя, радасная]; [яшчэ лёгка плывуць па яе берагах прыгожыя фарбы цёмных пасяродку і белых наўкол воблачак].

[А зірніце, зірніце хутчэй]: [вунь там шпарка схавалася апошняя срэбная хмарка цераз сонца].

8. Вучні самастойна знаёмяцца з узорам сінтаксічнага і пунктуацыйнага разбору бяззлучнікавых складаных сказаў (матэрыял у падручніку с. 154 – 155)
Самастойны разбор аднаго са сказаў. Дэманстрацыя на дошцы.
9. Прэзентацыя вынікаў працы.
10. Фізхвілінка (у ходзе работы з тэксатамі). Зарадка для вачэй.
Вачамі напісаць:

1) лічбы ад 0 да 5;
2) сваё імя;
3) сённяшнюю дату (/////);
4) 6 васьмёрак.

11. Канструяванне бяззлучнікавых складаных сказаў. Па варыянтах: самастойнае стварэнне бяззлучнікавых складаных сказаў розных відаў, перабудова іх у злучнікавыя, расстаноўка і тлумачэнне знакаў прыпынку,

**1-ы варыянт:**

**З простых сказаў утварыце складаныя бяззлучнікавыя сказы. Пастаўце знакі прыпынку:**

1) Па зямлі паплылі туманы. Набліжаўся досвітак.
2) Рушыўся снег, зашумела вада, раскаваліся рэкі ад лёду. Прйшла вясна.
3) Ранак луг расой купае. Дзень гарачы будзе.
4) Мы ўжо не просім міласці ў прыроды. Прырода моліць міласці ў нас.

**2-і варыянт:**

**Да простых сказаў далучыце ўласныя, каб атрымаліся складаныя бяззлучнікавыя сказы:**

1) На двары адчуваецца набліжэнне вясны...
2) Надвор'е стала псавацца...
3) Набягалі павевы ветру...
4) Звыклыя гукі напоўнілі лясныя гушчары...

12. Узаемаправерка
13. Падагульненне вывучанага. Рэфлексія.
- Выкажыце свой стан, пачуцці пры дапамозе бяззлучнікавага складанага сказа.
- Як вы ставіцеся да прыроды?
- Чаму так важна сёння берагчы навакольнае асяроддзе?

14. Дамашняе заданне: 1) або 2)
1) напісаць сачыненне-мініяцюру “Канец зімы” (6-7 сказаў) на ўсе выпадкі пастаноўкі знакаў прыпынку ў складаных бяззлучнікавых сказах.
2) падрыхтаваць адказы на кантрольныя пытанні ў форме звязнага паведамлення

**ТЭСТ ПА ТЭМЕ “БЯЗЗЛУЧНІКАВЫЯ СКЛАДАНЫЯ СКАЗЫ: БУДОВА, ЗНАЧЭННЕ, УЖЫВАННЕ”**

**Варыянт1**

**1. Адзначце сэнсавыя адносіны, якія могуць выражацца аднатыпнымі часткамі бяззлучнікавага складанага сказа:**

1) часавыя;
2) прычынныя;
3) супастаўляльныя;
4) умоўныя;
5) супрацьпастаўляльныя.

**2. Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы:**

1) Можна было падумаць, што зямля варушыцца пасля доўгага зімовага сну. (*П. Броўка*)
2) Сонца садзілася з шматпавярховыя будынкі горада, асвятляла іх (*У. Саламаха*)
3) Марозны ветрык пашчыпваў шчокі і нос, лёгкія паслухмяныя лыжы весела шалясцелі па снезе (*Я. Бяганская*)
4) Цёплае красавіцкае паветра ўварвалася ў пакой, напоўніла яго веснавой свежасцю, закружыла галаву (*А. Васілевіч*)
5) На станцыі пачуўся званок дзяжурнага, пасажыры на пероне замітусіліся, пачалі разбягацца па вагонах (*А. Кулакоўскі*).

**3. Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы з аднатыпнымі часткамі:**

1) Бусел-тата і бусліха-мама не маюць ніводнай хвілінкі для адпачынку: трэба даглядаць дзяцей (*І. Муравейка*)
2) У Гарновай твар свяціўся радаснай свежасцю, вочы блішчэлі маладым захапленнем (*М. Зарэцкі*)
3) Мільгаюць матылькі, гудзе касматы чмель (*В. Гурскі*)
4) Раптам бачу: паволі падае на зямлю адзінокі жоўты лісток (*Р. Ігнаценка*)
5) Хлопцы паўзлі наперад не дыхаючы, сэрцы іх калаціліся (*Я. Маўр*)

**4. Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску:**

1) Вечар сыходзіць на вялізны горад _ моцны вецер, ідучы з узмор’я, запаўняе вуліцы і плошчы, кружыць у глухіх дварах, над адталымі гурбамі (*Э. Самуйлёнак*)
2) Вось ужо гром грукоча над самай галавой _ маланка зіхаціць безупынна _ вецер хістае дрэвы (*Я. Маўр*)
3) Вось і збылася мая запаветная мара _ мне далі кватэру! (*М. Вяршынін*)
4) Якраз прыпала свята вызвалення _ усюды сцягі, зелень, кветкі, музыка, людзі з ордэнамі, медалямі на грудзях (*А. Кудравец*)
5) Шкло ў акне на верандзе пазвоньвала _ блізка ў буфеце ў такт грымотам адзываліся пераразвонам крыштальныя келіхі (*М. Даніленка*)

**5. Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць двукроп’е:**

1) Тут ужо кіпела жыццё _ звінелі на палянках пчолы, у кустах і на дрэвах спявалі птушкі (*С. Кухараў*)
2) Жнівеньскае неба блішчэла, як свежарэзанае волава _ дзьмуў тугі цёплы вецер (*А. Наварыч*)
3) Перавярнуўся воз _ раскідалася дабро (*М. Баскін*)
4) Прачытаў Алесь пісьмо, задумаўся _ сапраўды, рэдка ўсміхаецца мама (*А. Якімовіч*)
5) Палахлівае здзіўленне расло і расло _ такога мноства людзей я яшчэ ніколі не бачыў (*І. Грамовіч*)

**6. Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць працяжнік:**

1) Зірнуў Мірон і яшчэ болей здзівіўся _ там, высока над зямлёй, скакала жаба (*Я. Маўр*)
2) Спеюць парэчкі _ адцвітаюць белыя півоні (*У. Караткевіч*)
3) Праца кіпіць _ аж зямля дрыжыць (*З. Бядуля*)
4) Гола ў полі _ жыта звезена даўно (*Я. Колас*)
5) Пастух будзе гнаць статак на падвячорак _ выгані карову за вароты (*І. Грамовіч*)

**ТЭСТ ПА ТЭМЕ “БЯЗЗЛУЧНІКАВЫЯ СКЛАДАНЫЯ СКАЗЫ: БУДОВА, ЗНАЧЭННЕ, УЖЫВАННЕ”**

**Варыянт 2**

**1. Адзначце сэнсавыя адносіны, якія могуць выражацца аднатыпнымі часткамі бяззлучнікавага складанага сказа:**
1) часавыя;
2) прычынныя;
3) супастаўляльныя;
4) умоўныя;
5) супрацьпастаўляльныя.

**2. Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы:**
1) Можна было падумаць, што зямля варушыцца пасля доўгага зімовага сну. (*П. Броўка*)
2) Сонца садзілася з шматпавярховыя будынкі горада, асвятляла іх (*У. Саламаха*)
3) Марозны ветрык пашчыпваў шчокі і нос, лёгкія паслухмяныя лыжы весела шалясцелі па снезе (*Я. Бяганская*)
4) Цёплае красавіцкае паветра ўварвалася ў пакой, напоўніла яго веснавой свежасцю, закружыла галаву (*А. Васілевіч*)
5) На станцыі пачуўся званок дзяжурнага, пасажыры на пероне замітусіліся, пачалі разбягацца па вагонах (*А. Кулакоўскі*).

**3. Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы з аднатыпнымі часткамі:**
1) Бусел-тата і бусліха-мама не маюць ніводнай хвілінкі для адпачынку: трэба даглядаць дзяцей (*І. Муравейка*)
2) У Гарновай твар свяціўся радаснай свежасцю, вочы блішчэлі маладым захапленнем (*М. Зарэцкі*)
3) Мільгаюць матылькі, гудзе касматы чмель (*В. Гурскі*)
4) Раптам бачу: паволі падае на зямлю адзінокі жоўты лісток (*Р. Ігнаценка*)
5) Хлопцы паўзлі наперад не дыхаючы, сэрцы іх калаціліся (*Я. Маўр*)

**4. Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску:**
1) Вечар сыходзіць на вялізны горад _ моцны вецер, ідучы з узмор’я, запаўняе вуліцы і плошчы, кружыць у глухіх дварах, над адталымі гурбамі (*Э. Самуйлёнак*)
2) Вось ужо гром грукоча над самай галавой _ маланка зіхаціць безупынна _ вецер хістае дрэвы (*Я. Маўр*)
3) Вось і збылася мая запаветная мара _ мне далі кватэру! (*М. Вяршынін*)
4) Якраз прыпала свята вызвалення _ усюды сцягі, зелень, кветкі, музыка, людзі з ордэнамі, медалямі на грудзях (*А. Кудравец*)
5) Шкло ў акне на верандзе пазвоньвала _ блізка ў буфеце ў такт грымотам адзываліся пераззвонам крыштальныя келіхі (*М. Даніленка*)

**5. Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць двукроп’е:**
1) Тут ужо кіпела жыццё _ звінелі на палянках пчолы, у кустах і на дрэвах спявалі птушкі (*С. Кухараў*)
2) Жнівеньскае неба блішчэла, як свежарэзанае волава _ дзьмуў тугі цёплы вецер (*А. Наварыч*)
3) Перавярнуўся воз _ раскідалася дабро (*М. Баскін*)
4) Прачытаў Алесь пісьмо, задумаўся _ сапраўды, рэдка ўсміхаецца мама (*А. Якімовіч*)
5) Палахлівае здзіўленне расло і расло _ такога мноства людзей я яшчэ ніколі не бачыў (*І. Грамовіч*)

**6. Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць працяжнік:**
1) Зірнуў Мірон і яшчэ болей здзівіўся _ там, высока над зямлёй, скакала жаба (*Я. Маўр*)
2) Спеюць парэчкі _ адцвітаюць белыя півоні (*У. Караткевіч*)
3) Праца кіпіць _ аж зямля дрыжыць (*З. Бядуля*)
4) Гола ў полі _ жыта звезена даўно (*Я. Колас*)
5) Пастух будзе гнаць статак на падвячорак _ выгані карову за вароты (*І. Грамовіч*)

Адказы

| Заданне | Варыянт 1 | Варыянт 2 |
| --- | --- | --- |
| 1 | 1,3,5 | 1,2,5 |
| 2 | 3,5 | 1,5 |
| 3 | 2,3,5 | 3,4 |
| 4 | 1,2,5 | 1,4,5 |
| 5 | 1,4,5 | 1,3,4 |
| 6 | 3,5 | 2,4 |